# УДЗЕЛ НАСТАЎНІЦТВА У ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ БССР У 20-30-Я ГГ. ХХ СТ.

Куракевіч Н. І.[1]

[1].Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники

У працэсе пабудовы новага грамадства перавага надавалася ідэалагічным і палітычным падыходам у кіраўніцтве як эканомікай, так і сацыяльнай сферай. Таму грамадска-палітычнае жыццё ў значнай ступені вызначала стан усяго грамадства. Адной з галоўных умоў пераўтварэнняў у галіне народнай асветы зяўлялася павелічэнне грамадска-палітычнай актыўнасці настаўніцтва, прыцягненне яго да сацыялістычнага будаўніцтва.

Важную ролю ў гэтым адыграў створаны ў 1919 г. Саюз работнікаў асветы. У 1921 г. адбылося зліццё Саюза работнікаў асветы з Саюзам работнікаў мастацтва і ўтварыўся адзіны прафесійны Саюз работнікаў мастацтва і асветы Беларусі [1, с. 19-20]. Але ж у ліпені 1922 г. ён зноў быў падзелены на два самастойныя прафсаюзы [2, с.55]. У 1923-1925 гг. Саюз работнікаў асветы Беларусі з’яўляўся ўжо масавай арганізацыяй. Ён далучыў у сваю арганізацыю, па сутнасці, увесь педагагічны персанал. Акрамя таго, у 1922 г. у яго склад увайшлі прадстаўнікі друку, у 1923 г. - прадстаўнікі партыйных органаў, у 1924 г. - навуковыя працаўнікі [3, с.5]. Колькасць членаў саюза павялічылася з 6 463 чалавек на 1 студзеня 1924 г. [4, с.8 ] да 15 157 чалавек у канцы 1925 г. [5, с.128].

29 ліпеня 1924 г. работнікі асветы святочна адзначылі пяцігадовы юбілей свайго саюза. У гэты дзень яны прайшлі па вуліцах Мінска, дэманстравалі салідарнасць з Савецкай уладай. У Палацы культуры адбыўся святочны сход, на якім членаў саюза горача віталі прадстаўнікі ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ, Наркамасветы БССР, Чырвонай Арміі, піянеры. Святочны сход завяршыўся прыняццем рэзалюцый, у якіх Саюз работнікаў асветы пацвердзіў далучэнне да палітычнага курсу, які праводзіла дзяржава. Сходы і маніфестацыі з выпадку пяцігадовага Юбілею Саюза работнікаў асветы адбыліся ў Віцебску, Магілёве, Оршы і іншых гарадах рэспублікі [6, с. 128-130].

У вітанні ЦК КП(б)Б Саюзу работнікаў асветы ў дзень юбілея адзначалася, што ў настроі настаўніцтва, яго палітычных імкненнях вызначыўся рэзкі пералом.

Гэта знайшло адлюстраванне ў масавых палітычных выступленнях настаўніцтва, а таксама ў тым уздыме, з якім педагогі праводзілі заняткі на

курсах і ў гуртках па павышэнні грамадска-палітычнага ўзроўню. ЦК КП(б)Б адзначыў працу настаўнікаў у хатах-чытальнях, сельскіх гуртках, кааперацыі, правядзенні агітацыйна-прапагандысцкай работы і г.д. [7, с. 93].

Адгукнуўшыся на заклік савецкага ўрада і Камуністычнай партыі, настаўніцтва Беларусі актыўна ўключылася ў барацьбу з голадам, які ахапіў нашу краіну ў 1921 г. Пры Цэнтральным праўленні Саюза работнікаў асветы Беларусі, на месцах былі створаны камісіі дапамогі галадаючым, якія праводзілі агітацыйна-прапагандысцкую работу, арганізоўвалі добраахвотную падтрымку насельніцтва зернем, бульбай, грашыма, праводзілі суботнікі, арганізоўвалі платныя спектаклі, латэрэі і г.д. Работнікі асветы добраахвотна адлічвалі ў фонд галадаючым частку свайго заробку. Паводле звестак, да 1 лістапада 1921 г. школьнымі работнікамі было сабрана ў фонд дапамогі галадаючым Паволжа 644 пуды жыта і аўса, 353 пуды мукі, 1644 пуды бульбы, 32 пуды проса, 12 пудоў грэчкі, 8 пудоў гароху, больш 140 аршын палатна і 23 441 565 рублёў грашыма. Акрамя таго, работнікі асветы Мінска да 1 студзеня падрыхтавалі галадаючым больш 1 230 пудоў прадуктаў харчавання, 118 758 752 рублі грашыма. Галадаючым Паволжа былі пасланы і іншыя прадукты харчавання і прадметы першай неабходнасці (сала, тытунь, запалкі) [1, с.21; 277, с.30-31].

Настаўнікі ўдзельнічалі ў агітацыйна-прапагандысцкай дзейнасці, барацьбе з бандытызмам, рабоце харчовай камісіі, правядзенні пралетарскіх свят, суботнікаў. Па рашэнню IV з'езда Саюза работнікаў асветы Беларусі з мая 1923 г. праводзілася культурнае шэфства над Чырвонай Арміяй. Намаганнямі 938 школьнымі работнікамі да 1 красавіка 1924 г. была ліквідавана непісьменнасць 1280 дапрызыўнікоў у Чырвоную Армію, што складала 20% іх агульнай колькасці [8, с.9].

Новы этап у разгортванні грамадска-палітычнай дзейнасці настаўніцтва распачала пастанова ЦК РКП(б) ад 4 сакавіка 1924 г. "О работе среди сельского учительства", у якой таксама адзначаўся бясспрэчны перапом палітычных арыентацый у бок Савецкай улады. Пастанова ставіла задачу больш шырокага прыцягнення сельскага настаўніка да работы ў хатах-чытальнях, народных дамах, дамах селяніна, школах, саўгасах, да работы па ліквідацыі непісьменнасці, арганізацыі і правядзенні грамадска-палітычных кампаній, экскурсій, кружкоў фізкультуры, спектакляў, канцэртаў, рэвалюцыйных свят.

Прапаноўвалася прыцягваць настаўніцтва да работы ў якасці карэспандэнтаў газет і арганізатараў гурткоў селькораў, да садзейнічання ў распаўсюджванні "Сялянскай газеты", "Бедноты" і мясцовага Друку, да ўдзелу ў кааператарскай дзейнасці і рабоце дэлегацкіх сходаў сялянак [9, с.445].

XIII з'езд РКП(б) адзначыў, што "значны палітычны зрух сярод сельскага

настаўніцтва ў бок Савецкай улады робіць для партыі асабліва важным выкарыстанне яго ў якасці праваднiка на вёсцы палітыкі партыі і Савецкай улады па лініі гаспадарчай, культурна-асветніцкай і грамадска-палітычнай” [51, с.102].

Органы ўлады накіроўвалі грамадска-палітычную дзейнасць настаўніцтва. У 1924/25 навучальным годзе ў БССР 3301 настаўнік працаваў кіраўніком культурна-асветніцкіх кружкоў, 1 574 - на лікпунктах, 1 332 - у хатах-чытальнях, 1 269 - у сельскіх Саветах і 611 - у кааперацыі. У гэтым жа годзе 5 832 сельскіх настаўнікаў выканалі 7 438 грамадскіх даручэнняў. Да канца аднаўленчага перыяду ў грамадскую работу быў уцягнуты прыкладна кожны трэці гарадскі настаўнік [7, с.95-96 ].

Нельга не сказаць і пра некаторыя сур’ёзныя недахопы ў правядзенні грамадскай работы настаўніцтва. Перш за ўсё яна ў значнай ступені праводзілася без планавання і сістэмнасці, стыхійна, без належнага кіраўніцтва з боку органаў народнай адукацыі і мясцовых камітэтаў Саюза работнікаў асветы. Многія настаўнікі былі перагружаны грамадскімі даручэннямі, што не дазваляла ім удасканальваць вучэбна-выхаваўчую работу ў школе, павышаць свой ідэйна-палітычны ўзровень і педагагічную кваліфікацыю. Грамадская работа настаўнікаў не заўсёды ўзгаднялася з іх педагагічнай дзейнасцю, праз што мелі месца выпадкі, калі школа працавала на працягу трох дзён у тыдзень, а астатні час настаўнікі выконвалі грамадскія даручэнні.

Штуршком для актывізацыі грамадска-палітычнай дзейнасці настаўніцтва з’яўляліся Рэспубліканскі з’езд прадстаўнікоў асветы і І Усесаюзны з’езд прадстаўнікоў асветы, якія прайшлі ў студзені 1925 г. Гэтыя форумы дапамаглі асноўнай масе настаўніцтва канчаткова вызначыць сваё месца ў барацьбе за перамогу сацыялізму, усвядоміць характар і сутнасць памылак і хістанняў у папярэдні перыяд, адмовіцца ад іх і згуртавацца вакол Савецкай улады [10, с.400-403]. І Усесаюзны з’езд аформіў і замацаваў здзейснены ў большасці настаўніцтва зрух у бок Савецкай улады. У БССР у канцы 1925 г. 5 958 настаўнікаў з’яўляліся членамі “МОПРа”, 3 895 - “Осоавиахима”, 2 228 - таварыства “Долой неграмотность”, 1 028 чалавек працавалі селькорамі, 604 з’яўляліся членамі праўленняў і рэўкамісій кааператываў, 2 517 працавалі ў хатах-чытальнях і 936 чалавек прымалі ўдзел у шэфстве над Чырвонай Арміяй. Акрамя таго, 628 работнікаў асветы былі абраны членамі сельсаветаў, 121 - райвыканкамаў, 66 - акрвыканкамаў, 27 - кандыдатамі і 3 - членамі ЦВК БССР [5, с. 128-129].

ІІ Усебеларускі з’езд настаўнікаў, які праходзіў у Мінску ў маі 1926 г., вызначыў асноўныя формы масава-палітычнай і культурна-асветніцкай дзейнасці. Гэта работа ў сельсаветах, камітэтах сялянскай грамадскай

узаемадапамогі, арганізацыя беднаты разам з сярэднякамі для ізалявання кулака, умацавання саюзу рабочага класа і сялянства, культурнае шэфства над рабочымі арганізацыямі, садзейнічанне ў абслугоўванні гарадской і местачковай беднаты [7, с.150].

У 1927 г. у рэспубліцы была праведзена праверка грамадскай дзейнасці сельскага настаўніцтва ў Віцебскай, Аршанскай і Мінскай акругах, якая паказала, што настаўнікі з'яўляліся членамі райвыканкамаў, членамі сельсаветаў, членамі праўленняў кааператываў і іх рэвізійных камісій, працавалі ў хатах-чытальнях, прымалі ўдзел у правядзенні палітычных кампаній, праводзілі гутаркі сярод сялян, з'яўляліся селькорамі і рабселькорамі, выконвалі даручэнні ў кружках, створаных ячэйкамі КП(б)Б, у ячэйках і кружках ЛКСМБ. Многія настаўнікі працавалі ў выбарных органах добраахвотных грамадскіх арганізацый, з'яўляліся членамі краязнаўчых таварыстваў, у якіх праводзілі збор фальклору, песень, раскопкі курганоў, выступалі перад працоўнымі з лекцыямі і дакладамі [7, с. 151-152].

Настаўнікі Беларусі прапагандавалі рашэнні Савецкага ўрада, праводзілі агітацыю сярод сялянства за ўступленне ў калгасы, аказвалі дапамогу ў правядзенні пасяўных, уборачных і хлебанарыхтоўчых кампаніях. З ліку настаўнікаў у вёску накіроўваліся ініцыятыўныя групы і брыгады па ўтварэнні калгасаў, аказанні ім дапамогі ў арганізацыі працы, складанні вытворчых планаў, культурным абслугоўванні сельскіх працаўнікоў. Толькі ў час вясенняй пасяўной кампаніі 1930 г. у вёску было накіравана 2 118 работнікаў асветы ў складзе 530 брыгад. У час хлебанарыхтовак настаўнікі Старасельскай і Радужскай школ Веткаўскага раёна праводзілі дэманстрацыі з лозунгамі за пастаўку хлеба кааперацыі, а настаўнікі Чырвоназнаменскай, Глухаўскай і Свяцілавіцкай школ арганізавалі Чырвоныя абозы, у выніку было здадзена дзяржаве 300 пудоў зерня і 500 пудоў бульбы [7, с.156]. У час кампаній перавыбараў Саветаў па ініцыятыве работнікаў асветы склікаліся сходы батракоў, беднаты і жанчын. Настаўнікі праводзілі растлумачальную работу сярод навучэнцаў і іх бацькоў, складалі заклікі, пратаколы, спісы выбаршчыкаў.

III з'езд настаўнікаў Беларусі (люты 1931г.) вызначыў новыя межы ў дзейнасці настаўніцтва пашырыўшы маштабы і паскорыўшы тэмпы яго вытворчай і грамадскай работы.

Савецкай уладзе з першых дзён яе існавання давялося ратаваць дзяцей-сірот і беспрытульных. Тысячы дзяцей засталіся без бацькоў пасля першай сусветнай вайны. За гады грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі праблема беспрытульнасці прыняла вялікія маштабы. У час ваенных дзеянняў, масавых забойстваў, цяжкага матэрыяльнага становішча працоўных горада і вёскі тысячы дзяцей і падлеткаў засталіся без прытулку і бацькоў. У Беларусі ў пачатку аднаўленчага перыяду налічвалася больш за 20 тысяч беспрытульных [11, с. 11].

Вялікую ролю ў барацьбе з дзіцячай беспрытульнасцю адыграла настаўніцтва. Органамі народнай асветы і аховы здароўя разам з Цэнтральнай

камісіяй “Дапдзет”, утворанай у лютым 1921 г., яны займаліся ўлікам беспрытульных, адкрывалі дзіцячыя дамы, калоніі, камуны, розныя майстэрні, аказвалі дзецям дапамогу грашыма, адзеннем, абуткам і г.д.

Павелічэнне колькасці дзіцячых дамоў назіраецца з канца 1921 г., а з восені 1923 г., калі дзеці з Паволжа і іншых рэгіёнаў, пацярпеўшых ад засухі, ад’язджалі на радзіму, сетка дзіцячых дамоў пачала скарачацца, больш мелкія былі аб’яднаны ў буйныя, вёўся ўважлівы перагляд складу іх выхаванцаў. Дзіцячыя ўстановы будаваліся так, каб яны маглі быць сапраўднымі сродкамі працоўнага выхавання. Магілёўскаму акруговаму аддзелу народнай асветы пры дапамозе акруговага выканаўчага камітэта ўдалося ажыццявіць гэтую задуму шляхам арганізацыі так званых дзіцячых працоўных сельскагаспадарчых камун. Пад гэтыя камуны каля самага Магілёва былі адведзены чатыры фермы-гаспадаркі. У гэтых гаспадарках было 350 дзесяцін зямлі, 60 дзесяцін пладовага саду, інвентар, будынкі і інш. Там размяшчаліся 180-200 выхаванцаў. Апрача сельскай гаспадаркі былі яшчэ майстэрні для навучання дзяцей рамёствам: сталярнаму, шавецкаму, кавальскаму і інш. [12, с.16].

У 1924-1925 гг. у БССР паводле падлікаў мелася 2 695 беспрытульных дзяцей, у 1925-26 гг. іх колькасць дасягнула 5 000 чалавек [12, с. 12]. Наркамасветы і яго мясцовым органам, нягледзячы на цяжкасці, удалося стабілізаваць сетку дзіцячых дамоў і дасягнуць значных поспехаў у барацьбе з беспрытульнасцю. У 1926 г. у 73 дзіцячых дамах утрымлівалася 5 660 дзяцей, у 1927 г. - 6 041, столькі ж іх было і ў 1928 г. [11, с.16].

Настаўнікі дзіцячых дамоў вялікую ўвагу надавалі вучэбна-выхаваўчай рабоце. Першапачаткова пры ўсіх дамах існавалі агульнаадукацыйныя школы, але з цягам часу іх пачалі закрываць, а дзяцей накіроўвалі ў бліжэйшыя школы. У 1929 г. пры многіх дзіцячых дамах, асабліва пры камунах і калоніях, меліся чатырохгадовыя і сямігадовыя школы. Усе выхаванцы дзіцячых дамоў вучыліся ў школах.

Дзеці з дзіцячых дамоў удзельнічалі ў навакольным жыцці горада ці вёскі, у залежнасці ад месца знаходжання. Настаўнікі дзіцячых дамоў у прамысловых гарадах арганізоўвалі наведванне фабрык і заводаў, праводзілі выстаўкі на сходах рабочых ці ў рабочых клубах, дапамагалі выхаванцам рыхтаваць даклады пра жыццё і працу рабочых дадзенага прадпрыемства, праводзілі сумесныя святкаванні і ўдзел у дэманстрацыях, удзельнічалі ў ліквідацыі непісьменнасці сярод рабочых, пераводзілі на прадпрыемствы перарасткаў-выхаванцаў дзіцячага дома. У вёсцы навучэнцы дзіцячых дамоў разам з настаўнікамі сістэматычна аказвалі гаспадарча-арганізацыйную дапамогу найбольш слабым гаспадаркам вёскі, удзельнічалі ў рабоце палітыка-асветных устаноў, хат-чытален, пунктаў па ліквідацыі непісьменнасці, праводзілі гутаркі, чытанні, арганізоўвалі насценныя газеты, адзначалі

рэвалюцыйныя святы разам з жыхарамі [13, с.37].

У сакавіку 1929 г. Прэзідыум ЦВК БССР даручыў Наркамасветы на працягу 2-х гадоў правесці рэарганізацыю з мэтай умацавання працоўнага выхавання ў дзіцячых дамах. Важную ролю ў гэтым адыгралі майстэрні: абутковыя, партняжныя, сталярныя, пераплётныя, а таксама мастацкія студыі. Колькасць іх павялічвалася, і ў 1929 г. у дзіцячых дамах рэспублікі налічвалася 80 майстэрань. У аднаўленчы перыяд у рэспубліцы працавалі такія дзіцячыя ўстановы, як дамы юнацтва. Яны былі адкрыты ў Мінску, Мазыры, Віцебску, Барысаве. У іх утрымліваліся дзеці старэйшых узростаў. Дом юнацтва імя Карла Лібкнехта ў Мінску да 1923 г. называўся камунай. Пры Доме меліся сталярная, пераплётная, шавецкая, майстэрні для пляцення кошыкаў. Выхаванцы выраблялі нескладаныя хатнія рэчы, пераплятaлі кнігі, рамантавалі мэблю. Прадукцыя майстэрань прызначалася перш за ўсё для асабістых патрэб выхаванцаў. Майстэрні выконвалі таксама заказы гарадскога аддзела народнай адукацыі [11, с.17-18].

Эфектыўным сродкам замацавання падлеткаў на вытворчасці з’яўлялася ўвядзенне броні, г.зн. абавязковае залічэнне на працу вызначанай колькасці падлеткаў. Правядзеннем броні ў рэспубліцы займалася камісія, якая складалася з прадстаўнікоў Наркамата працы, Савета прафесіянальных саюзаў, Савета народнай гаспадаркі, Камуністычнага саюза моладзі Беларусі. Камісія сачыла за правільнасцю запаўнення броні, а таксама за навучаннем падлеткаў. Настаўніцтва аказвала дапамогу ў размеркаванні па броні падлеткаў, якія пераводзіліся на прадпрыемствы, у вучэбна-вытворчыя майстэрні, школы ФЗО, прафшколы.

Настаўнікі адыгралі важную ролю ў прафілактыцы беспрытульнасці. Яны давалі неабходныя веды падлеткам, арганізоўвалі іх вольны час, рыхтавалі падлеткаў да актыўнай працоўнай дзейнасці. Настаўнікі стваралі атмасферу цеснай сувязі паміж вучнямі і школай на працягу ўсяго года. Уплыў настаўнікаў заключаўся не толькі ў тым, што ён рабіў у школе, але і ў дзейнасці па-за школай: чытанне літаратуры, гутаркі, наведванне дзяцей у начны час, арганізацыя і ўдзел у дзіцячых гульнях і інш. Шмат зрабілі настаўнікі па прафілактыцы беспрытульнасці сярод вясковых дзяцей. Беспрытульныя дзеці ў вёсцы, якія былі адарваны ад разумнага жыцця і добрых уплываў, уяўлялі сабой добрую глебу для хворых настрояў. Прыкметамі масавай беспрытульнасці з’яўляліся курэнне, п’янства, хуліганства, крадзеж, лаянка і інш. Для выкаранення гэтых з’яў настаўніцтва прыкладвала шмат намаганняў.

У грамадска-палітычным жыцці Беларусі важным накірункам думкі быў нацыянал-дэмакратызм, які спалучаў агульнадэмакратычныя ідэі і мэты з задачамі сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення прыгнечаных народаў. Тэрмін “нацыянал-дэмакратызм” утварыўся для характарыстыкі рэвалюцыйна-

дэмакратычнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Беларусі ў канцы XIX - пачатку XX ст., скіраванага на дасягненне палітычнай самастойнасці, адраджэнне ; нацыянальнай культуры і самасвядомасці беларускага народа.

Практычным увасабленнем ідэалогіі нацыянальнай дзяржаўнасці была палітыка беларусізацыі, ажыццяўленне якой у 1920-я гады дазволіла сфарміраваць нацыянальную сістэму адукацыі, сродкі масавай інфармацыі і кнігавыдавецкую справу, актывізаваць удзел беларусаў у культурным і гаспадарчым жыцці. У сярэдзіне 1920-х гадоў Камуністычная партыя абвясціла нацыянал-дэмакратызм "контррэвалюцыйнай плынню, правым ухілам, варожай антысавецкай ідэалогіяй і практыкай". У рашэннях VII (1923 г.) і IX (1925 г.) з'ездаў КП(б)Б вызначана пазіцыя рашучай барацьбы з любымі адхіленнямі нацыянальнай палітыкі, у тым ліку з вялікадзяржаўным шавінізмам і мясцовым нацыяналізмам, супраць ажыццяўлення нацыяналістычных ідэалаў, адраджэння буржуазна-дэмакратычнай дзяржаўнасці.

Дэталёвы аналіз сутнасці нацыянал-дэмакратызму і форм яго праяўлення даў сакавіцкі (1926 г.) пленум ЦК КП(б)Б. У яго рэзалюцыі "Аб рабоце сярод інтэлігенцыі" адзначалася, што ў радах беларускай інтэлігенцыі адбываецца далейшая крышталізацыя нацыянал-дэмакратычных настрояў і ідэй, якія праяўляюцца ў адмаўленні дыктатуры пралетарыяту, імкненні да палітычнага ўраўнавання сялянства з рабочым класам, да так званай сялянскай (кулацкай) улады і ў наступальнай лініі ў адносінах да нацыянальных меншасцей. Сярод інтэлігенцыі выдзялялася група, актыўна-варожая палітыцы партыі, якая прадстаўляе нацыянал-дэмакратызм.

У дакументах XI з'езда КП(б)Б (1927 г.) адзначалася, што калі нацыянал-дэмакратызм у Беларусі ў мінулым быў прагрэсіўнай з'явай, змагаўся з самадзяржаўем і даваў адпор прыгнечанню з боку рускага царызму, то ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту ён стаў контррэвалюцыйнай з'явай, скіраванай супраць яе. Неабходнасць узмацнення барацьбы супраць нацыянал-дэмакратызму ў нацыянальным пытанні падкрэслівалася ў рашэннях лістападаўскага (1928 г.) аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б, XII з'езда КП(б)Б (1929 г.) і іншых партыйных дакументах.

У 30-я гады XX ст. у рамках барацьбы супраць нацыянал-дэмакратызму органамі НКУС БССР была сфабрыкавана справа аб "Саюзе вызвалення Беларусі" (па ёй былі арыштаваны дзяржаўныя дзеячы Д. Прышчэпаў, А. Баліцкі, Я. Дыла, акадэмікі АН Беларусі В. Ластоўскі, С. Некрашэвіч, пісьменнікі М. Гарэцкі, П. Галавач, У. Дубоўка, А. Дудар, Я. Пушча і інш.). Адным з рэпрэсіраваных быў акадэмік Язэп Юр'евіч Лёсік, які літаральна адразу пасля адкрыцця Беларускага дзяржаўнага універсітэта выкладаў там беларускую мову. Спецыялістаў-выкладчыкаў - і найперш па беларускай мове і літаратуры - у БДУ катастрафічна не хапала. Янка Купала, Якуб Колас, Максім

Гарэцкі, Язэп Лёсік і некаторыя іншыя працавалі не пакладаючы рук. Яны вучылі роднай мове не толькі студэнтаў, аде і сваіх калег-педагогаў. Не адразу, а з цягам часу, прыйшоў поспех: ужо ў 1927 г. дзве трэці навучальных гадзін ва універсітэце выкладалася на беларускай мове. Мова Францыска Скарыны, якая стагоддзямі прыніжалася, паступова пачынала гучаць на ўвесь свет. Намаганнямі нешматлікіх выкладчыкаў, і галоўным чынам яго, Язэпа Юр'евіча Лёсіка, быў адкрыты багаты для таго перыяду кабінет беларускай мовы і літаратуры, кнігі і дапаможнікі для якога перадала Дзяржаўная бібліятэка Беларусі.

Язэп Лёсік - аўтар некалькіх літаратурных твораў, падручнікаў па беларускай мове. У архівах Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, Дзяржаўнай бібліятэкі, Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН Беларусі і ў прыватных захоўваннях некаторых мовазнаўцаў і літаратараў знаходзяцца дзевяць выданняў навуковых мовазнаўчых прац і літаратурных твораў Лёсіка, выдадзеных у рэспубліцы на працягу 1921-1927 гадоў. Гэта "Беларускі правапіс", "Школьная граматыка беларускае мовы", "Сінтаксіс беларускае мовы", "Граматыка беларускае мовы", "Сынтакс беларускае мовы", "Граматыка беларускае мовы. Фонэтыка", "Граматыка беларускае мовы. Морфолёгія", "Практычная граматыка беларускае мовы", "Наша крыніца (кніга для чытаньня)", "Пачатковая граматыка беларускае мовы", "Ня ўсе ж разам, ягамосьці (апавяданне)". Асаблівай папулярнасцю карысталіся яго вучэбныя дапаможнікі па граматыцы. Выходзілі яны тыражом у некальні тысяч экземпляраў і распрадаваліся даволі хутка [14, с.97]. У 1928 г. Я. Лёсік абраны акадэмікам Беларускай Акадэміі навук. У ліпені 1930 г. Лёсік быў арыштаваны па падазрэнні ў нацдэмаўскай дзейнасці. У 1940 г. памёр у саратаўскай турме. Рэабілітаваны ў 1988 г., у маі 1990 г. Я.Ю. Лёсік адноўлены ў званні акадэміка Акадэміі навук Беларусі.

У канцы 1920-х - пачатку 1930-х гг. быў сфабрыкаваны шэраг спраў, па якіх да крымінальнай адказнасці былі прыцягнуты і потым рэпрэсіраваны многія прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. Ішло таксама скарачэнне беларускамоўных школ, выдання беларускіх кніг і газет, замена беларусаў на кіруючых пасадах.

Такім чынам, у 1921-1930 гг. палітыка Савецкай улады была накіравана на ўзмацненне масава-палітычнай і культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва. Адну з вядучых роляў у гэтай дзейнасці адыграла настаўніцтва. Яно ўдзельнічала ў рабоце ЦВК БССР, акрвыканкамаў, гарадскіх, раённых і сельскіх Савстаў, партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацый, камітэтах сялянскай грамадскай узаемадапамогі, народных дамоў дамоў селяніна, хат-чытальняў, клубаў і іншых клубна-асветніцкіх устаноў, у барацьбе з голадам, ахапіўшым краіну ў 1921 г., бандытызмам у 1921-1922 гг.,

у арганізацыі і правядзенні грамадска-палітычных кампаній, экскурсій, спектакляў, канцэртаў, рэвалюцыйных свят. Настаўнікі працавалі членамі праўленняў кааператываў і іх рэвізійных камісій, ажыццяўлялі культурнае шэфства над Чырвонай Арміяй і рабочымі арганізацыямі, з'яўляліся селькорамі і рабселькорамі, выконвалі даручэнні ў кружках, створаных партыйнымі і камсамольскімі ячэйкамі, былі членамі краязнаўчых таварыстваў, выступалі перад працоўнымі з лекцыямі дакладамі. Гэта садзейнічала павышэнню грамадска-палітычнага ўзроўню настаўніцтва, прыцягненню яго да сацыялістычнага будаўніцтва. Настаўнік прабіваў сабе дарогу да тых сацыяльных вышынь, якія вызначаліся як прыярытэтныя і на якія ён ніколі не паднімаўся ў дакастрычніцкі час.

Настаўніцтва Беларусі прыняло ўдзел у вырашэнні такой праблемы як ліквідацыя дзіцячай беспрытульнасці. Яно займалася прафілактыкай беспрытульнасці і ўлікам беспрытульных дзяцей, разам з дзяржаўнымі органамі адкрывала дзіцячыя дамы, калоніі, камуны і працавала там у якасці педагогаў і выхавацеляў, дапамагала дзецям вопраткай і абуткам, арганізоўвала іх вольны час, праводзіла гутаркі і чытанні літаратуры, стварала майстэрні для навучання дзяцей рамёствам. Разам са сваімі выхаваўцамі настаўнікі ўдзельцічалі ў грамадска-палітычным жыцці навакольных гарадоў і вёсак Беларусі. У аснове выхаваўчай работы ў дзіцячых дамах, калоніях і камунах, у адрозненне ад дзіцячых прытулкаў, якія існавалі ў дакастрычпіцкі час, знаходзіліся прынцыпы павагі да асобы дзіцяці, клопату пра яго фізічны і духоўны стан, выхавання пачуццяў калектывізму, патрыятызму, любові да Радзімы, імкнення да набыцця ведаў і карысных вытворчых навыкаў.

Літаратура:


1. Союз работников Просвещения Белоруссии в 1921 году // Вестник Народного Комиссариата Просвещения. -1922. -№2(4). -с.18-21.
2. В союзе работников просвещения и искусств // Вестник Народного Комиссариата Просвещения. -1922. -№5-6. -с.55.
3. Пяць год Саюзу працаўнікоў Асветы // Асвета. -1924. -№2. -с.5-7.
4. Саюз Працаўнікоў асветы ў пашыранай Беларусі // Асвета. -1924. -№2, -с.7-17.
5. Нашы дасягненні // Асвета. -1925. -№7(10). -с.127-130.
6. Інфармацыя і хроніка. Святкаванне пяцігадовага Саюзу Працаўнікоў асветы // Асвета. -1924. -№2. -с.128-129.
7. Новик Е.К. Формирование кадров народного образования Белоруссии (1917-1941). -Минск: Наука и техника, 1981. -295с.
8. Ближайшие задачи Союза работников просвещения // Асвета. -1924. -№1. -С.8-10.
9. Народное образование в СССР. Общеобразовательная школа: Сб. док.: 1917-1973 гг. / Сост.: А.А. Абакумов, Н.П. Кузин, Ф.И. Пузырёв, Л.Ф. Литвинов, - М. Педагогика, 1974. -559с.
10. Королёв Ф.Ф., Корнейчик Т.Д., Равкин З.И. Очерки по истории советской школы и педагогики 1921-1931. / Под ред: Ф.Ф. Королёва, В.З. Смирнова. -М.: Изд-во Акад. пед. наук РСФСР, 1961. -508с.
11. Рудкін В.Г. Борьба с детской беспризорностью в БССР (1921-1930 гг.). Автореф. дис. ... канд.ист.наук: (07.00.01) БГУ. Мінск. - 1981. -21с.
12. Пашас. Барацьба з беспрытульнасцю і дзіцячыя ўстановы // Асвета. -1926. -№6. -с.10-46.
13. Удзел дзіцячых дамоў у навакольным жыцці // Асвета. -1926. -№3. -с.36-38.
14. Мяснікоў А. Нацдэмы. - Мінск: Беларусь. -1993. -110с.